# ВЫХАВАННЕ ПАТРЫЯТЫЗМУ І ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ВУЧНЯЎ НА ВУЧЭБНЫХ ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І Ў ПАЗАКЛАСНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ



**Ізобава Ірына Міхайлаўна,**
*дырэктар ДУА "Янавіцкая сярэдняя школа Віцебскага раёна", настаўнік беларускай мовы і літаратуры*

Репозиторий ВГУ

## РЭАЛІЗАЦЫЯ ПРАЕКТА "ЯНАВІЧАНЕ"

*У артыкуле асветлена сістэма работы па выхаванні патрыятызму і фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці вучняў на вучэбных занятках па беларускай літаратуры і ў пазакласнай дзейнасці праз выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу навукова-даследчага цэнтра "Янавічане".*

*Шматгранная навучальная і пазакласная работа заснавана на мясцовым матэрыяле. Даюцца рэкамендацыі па арганізацыі вучэбных заняткаў і пазакласнай дзейнасці на аснове рэалізацыі праекта "Янавічане".*

**Уводзіны.** У сучасны момант вострай праблемай удасканалення выхаваўчага патэнцыялу ўрока літаратуры з'яўляецца вызначэнне асноўных напрамкаў яго практычнага ажыццяўлення. Сярод іх вядучае месца займае фарміраванне ў вучняў патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці. Менавіта патрыятычнае выхаванне на сучасным этапе павінна стаць стрыжнёвай лініяй у працэсе вучэбных і пазакласных заняткаў. Яму наканавана стаць тым сродкам, што абароніць моладзь ад шкоднага ўплыву сучаснай масавай культуры, нігілізму і абыякавасці, эгаізму і бязлітаснасці, якія нярэдка сустракаюцца ў школе. Нельга не пагадзіцца з акадэмікам Дз.С. Ліхачовым, які пісаў: "Любоў да роднага краю, веданне яго гісторыі – аснова, на якой толькі і можа ажыццяўляцца рост духоўнай культуры грамадства" [1]. Адарваны ад сваёй нацыянальнай культуры многія сучасныя бацькі. Яны не ведаюць народных традыцый, а значыць, не могуць перадаць іх сваім дзецям. І ў гэтым не іх віна. Праблема ў тым, што доўгі час наша нацыянальная культура была ў забыцці. Да яе не звярталіся ні ў паўсядзённым жыцці, ні ў святы, не вывучалі і наогул лічылі перажыткам. Зараз сітуацыя мяняецца. Аднак дзеці па-ранейшаму выхоўваюцца не на лепшых узорах сучаснага "маскульту", адарваны ад народнай спадчыны. Часта дзеці добра ведаюць розныя замежныя рок-групы і відэафільмы, захапляюцца героямі крывавых "баевікоў" і не маюць ніякага ўяўлення пра айчынных мастакоў, майстроў слова, творы мастацтва.

Агульнапедагагічнае і выхаваўчае значэнне дадзенай праблемы стала асновай для выбару ***тэмы*** вопыту "Выхаванне патрыятызму і фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці вучняў на ўроках беларускай літаратуры і ў пазакласнай дзейнасці праз рэалізацыю праекта «Янавічане»".

Патрыятычнае выхаванне ўключае ў сябе сістэму шматграннай навучальнай і пазакласнай работы, звязаную з фарміраваннем у вучняў пачуцця прывязанасці да тых месцаў, дзе яны нарадзіліся і выраслі, паважлівага стаўлення да гісторыі Радзімы, дзяржаўнай сімволікі, традыцый свайго народа.

Мэта працы – выхаванне патрыятызму і фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці

вучняў на ўроках беларускай літаратуры і ў пазакласнай дзейнасці праз выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу навукова-даследчага цэнтра “Янавічане”.

Задачы:

– вызначыць эфектыўныя шляхі выкарыстання краязнаўчага матэрыялу на ўроках беларускай літаратуры;

– стварыць умовы для развіцця творчых здольнасцей вучняў праз далучэнне да работы літаратурнага аб’яднання па зборы і апрацоўцы матэрыялаў краязнаўчага характару;

– далучыць вучняў да сацыяльна значнай дзейнасці праз арганізацыю пазакласнай работы ў працэсе рэалізацыі праекта “Янавічане”.

У гэтым накірунку я імкнуся ўдзяляць больш увагі падбору эфектыўных форм і метадаў уздзеяння на асобу вучня пры вывучэнні багатага і цікавага матэрыялу, якім напоўнены школьныя праграмы па беларускай мове і літаратуры, але дасягнуць поспеху, на маю думку, магчыма толькі пры адной умове – выкарыстаць глыбокі гістарычны рэгіянальны патэнцыял, прыцягнуўшы вучня да цікавейшага працэсу пазнання сваёй культурна-духоўнай спадчыны.

**Асноўная частка.** ***Вядучая ідэя*** нашага вопыту: “Вывучаючы родны край – выхоўваем патрыёта”.

Мяне хвалявала пытанне, якія ж асноўныя ідэі складаюць сутнасць праблемы выхавання патрыятызму і якія падыходы неабходны для яе вырашэння. Аналізуючы папярэдні вопыт работы, я прыйшла да наступных высноў.

***Выснова першая.*** Патрыятызм трэба разглядаць як адзінства духоўнага і дзейнасна-практычнага: нацыянальнай самасвядомасці, пачуцця любові да сваёй Радзімы, патрыятычных паводзін і культуры міжнацыянальных паводзін і адносін. А патрыятызм, між іншым, звычайна разумеюць даволі спрошчана, толькі як любоў да Радзімы.

Нацыянальная самасвядомасць – гэта ўсведамленне кожным з нас сваёй прыналежнасці да беларускай нацыі, нацыянальнай годнасці, нацыянальнай самапавагі, гонар за сваю гістарычную спадчыну, павага да родных традыцый, укладу жыцця, фальклору, далучанасць да духоўных багаццяў нацыі. Разуменне гэтага і адпаведныя дзеянні складаюць другі важны элемент патрыятызму [2].

Трэці важны кампанент – высокае пачуццё любові да сваёй Радзімы. Але любоў да Бацькаўшчыны не можа быць абстрактнай, яна павінна быць дзейснай. Такім чынам, чацвёрты важны кампанент патрыятызму – дзейснасць, якая мае яскрава выражаную патрыятычную накіраванасць [3].

Пры вывучэнні творчасці пісьменніка я раблю асаблівую ўвагу на той канкрэтны ўклад у літаратурны і грамадскі працэс, на той след у гісторыі Беларусі, які пакінуў той ці іншы пісьменнік. Гэта амаль заўсёды падштурхоўвае вучня на краязнаўчую працу, пошукавую дзейнасць, разнастайную працу, звязаную са стварэннем і работай гісторыка-краязнаўчых цэнтраў, складанне летапісаў свайго краю, дагляд брацкіх магіл, удзел у ваенна-спартыўных і нацыянальных гульнях, дабрачынных акцыях. Таму я лічу неабходным мэтанакіравана фарміраваць у сваіх вучняў усвядомленую гатоўнасць да патрыятычных учынкаў, дзеянняў у адпаведнасці са сваімі перакананнямі.

***Выснова другая.*** Патрыятызм – гэта з’ява гістарычная. Без ведання гістарычнага мінулага свайго народа нельга паспяхова будаваць наша сёння, а тым больш з надзеяй глядзець у будучыню, бо гісторыя народа – крыніца шматвяковага вопыту, невычэрпная крыніца патрыятызму.

***Выснова трэцяя.*** Патрыятызм – катэгорыя маральная, заснаваная на выхаванні і развіцці ў чалавеку ўсяго самага лепшага: дабрыні, спагадлівасці, чуласці, міласэрнасці, далучанасці да нацыянальных духоўных каштоўнасцей [4].

***Выснова чацвёртая.*** Неабходны культуралагічны падыход да зместу патрыятычнага выхавання. Мы засвойваем і ўсведамляем прыгажосць роднай мовы і літаратуры, народнага фальклору, традыцый, абрадаў, укладу жыцця народа, значнасць яго здзяйсненняў у матэрыяльнай, навуковай, культурнай і духоўнай сферах.

Асаблівую ўвагу вучняў я звяртаю на тыя мясціны літаратурнай спадчыны, дзе ўслаўляецца прыгажосць роднага краю, дзе ёсць разважанні аб нацыянальных каштоўнасцях, этычных асаблівасцях, характэрных для нашага краю.

Невычэрпнымі магчымасцямі для выхавання патрыятызму валодаюць жанры вуснай народнай творчасці: прыказкі, прымаўкі,

Репозиторий ВГУ

казкі, легенды, паданні, міфы, песні, у якіх услаўляецца душа народа, яго незалежнасць, працавітасць, кемлівасць. Вусная народная творчасць з'яўляецца хавальнікам і выразнікам шматвяковага гаспадарчага, жыццёвага вопыту народа, яго ведаў аб прыродзе, грамадстве, гістарычных падзеях і нацыянальных героях, аб выхаванні і маралі.

***Сутнасць вопыту.*** Для ажыццяўлення мэты педагагічнай дзейнасці і паспяховага рашэння пастаўленых задач у сваёй практыцы я вызначыла шляхі фарміравання нацыянальнай самасвядомасці вучняў як самага важнага і галоўнага элементу патрыятызму. Спынімся на самых важных.

***Шлях першы*** – выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу на ўроках беларускай літаратуры.

У працэсе рэалізацыі праекта "Янавічане" быў сабраны і апрацаваны багацейшы матэрыял па гісторыі роднага краю. Маёй важнай задачай як кіраўніка было зрабіць яго жывой крыніцай адукацыйнага працэсу.

Створаныя літаратурным аб'яднаннем "Янавічане" шматлікія зборнікі актыўна пачалі выкарыстоўвацца на занятках беларускай літаратуры (дадатак 1).

Я спрабавала розныя шляхі работы над вызначанымі на ўрок творамі. Менавіта ўжыванне ***праблемнага аналізу*** мастацкага твора на ўроках літаратуры з мэтай фарміравання самасвядомасці вучня стала тым важным элементам, які дапамагае ўстанавіць лагічную сувязь паміж краязнаўчым матэрыялам і літаратурным творам (дадатак 2).

Праблемны аналіз стаў здабыткам савецкай школы ў другой палове 60-х гг. Ён добра пададзены і ў методыцы выкладання літаратуры ў школе. Але трэба абавязкова падкрэсліць, што ў працэсе праблемнага аналізу выхоўваецца не толькі творчая самастойнасць вучняў, уменне асэнсоўваць і аргументаваць свае чытацкія ўражанні, абараняць выказаную думку, праблемны аналіз высокамастацкіх і ідэйна-патрыятычных твораў, якімі сёння насычана школьная праграма, – вось гэта ўдалы шлях да фарміравання самасвядомасці вучняў [5].

На сучасным этапе ўсе большае прызнанне атрымліваюць асобасна арыентаваныя тэхналогіі навучання, якія забяспечваюць развіццё і самаразвіццё асобы вучня, зыходзяць з выяўлення яго індывідуальных асаблівасцей як суб'екта пазнання прадметнай дзейнасці. Яны дазваляюць вучню рэалізаваць сябе ў пазнанні, вучэбнай дзейнасці, паводзінах.

У сваёй рабоце я выкарыстоўваю ***тэхналогію "педагагічных майстэрняў"***, бо знаходжу ў "педагагічнай майстэрні" адказ, як аб'яднаць праграмны твор і матэрыял краязнаўчага характару, каб ажыццявіць ідэі гуманізацыі і развіцця самасвядомасці вучняў. Метадычныя прыёмы (элементы) тэхналогіі "педагагічных майстэрняў": індукцыя, самаканструкцыя, разрыў, рэфлексія – гэта арыгінальны спосаб арганізацыі навучальнай дзейнасці, які ініцыіруе яе пошукавы, творчы характар і развівае цікавасць да краязнаўчага матэрыялу [6].

Заданні-"падказкі" – гэта інфармацыя, якую я выкарыстоўваю для стымулявання пазнавальнай дзейнасці вучняў. У іх якасці могуць выступаць гістарычныя веснікі (дадатак 3), фрагменты літаратурных твораў, выказванні выдатных людзей.

Я стараюся дэмакратычна кіраваць работай навучэнцаў, прытрымліваюцца пры гэтым наступных правілаў:

- стварыць атмасферу адкрытасці, добразычлівасці, сатворчасці ў зносінах;
- уключаць эмацыянальную сферу вучня, звяртацца да яго пачуццяў, абуджаць асобасную зацікаўленасць у вывучэнні праблемы;
- працаваць разам з навучэнцамі, быць роўнымі з імі ў пошуках ведаў;
- не спяшацца адказваць на пытанні;
- неабходную інфармацыю падаваць малымі дозамі;
- выключаць традыцыйнае ацэньванне работы вучняў (не папракаць, не ставіць адзнак, стварыць магчымасць для іх самаацэнкі, самакарэкцыі).

У сваёй практыцы актыўна выкарыстоўваю ***аналітычна-дыскусійныя формы*** вучэбных заняткаў па беларускай літаратуры:

- аналітычная дыскусія;
- урок-роздум;
- урок-дыялог;
- урок-канферэнцыя;
- урок-сумненне.

Каб дасягнуць поспехаў у фарміраванні самасвядомасці вучняў, я імкнуся да аналітычнага дыялогу, які дазваляе вучыць дзяцей думаць і граматна выказваць свае меркаванні.

***Шлях другі*** – выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу ў пазакласнай дзейнасці вучняў.

Репозиторий ВГУ

Пачала са знаёмства з рэгіянальнымі традыцыямі і звычаямі, творамі вуснай народнай творчасці, стварэння моўнага асяроддзя і павелічэння колькасці элементаў традыцыйнай (фальклорнай) культуры ў навучанні. І гэта дапамагло вучням адчуць сваю лучнасць з Янавіцкім краем.

Абудзіць у маладога пакалення цікавасць да культуры роднага краю – абавязак дарослых. У нашай школе створана этнаграфічная зала, дзе прадстаўлены амаль усе віды народнага мастацтва. Дзеці пры падрыхтоўцы да абрадавых свят сваімі рукамі дакранаюцца да рэчаў, якія зрабілі іх бабулі і дзядулі, а штосьці спрабуюць змайстраваць самі. Членамі літаратурнага аб'яднання складзены слоўнік дыялектных слоў Янавіцкай акругі, слоўнік мясцовых назваў.

Танцавальным калектывам вернуты з забыцця шэраг беларускіх народных танцаў. Музычны акампанемент быў зроблены мясцовым гарманістам Б.П. Кухаравым, дарэчы, незадоўга да яго смерці. Памяць аб гэтым таленавітым чалавеку зараз зберагае экспазіцыя залы.

У працэсе работы я арганізую сустрэчы вучняў з людзьмі, якія прайшлі агнявыя гады вайны, са знакамітымі мастакамі-землякамі, навуковымі супрацоўнікамі. Вучні прымаюць удзел у конкурсах знаўцаў свайго краю, раённых, абласных і рэспубліканскіх конкурсах навукова-даследчых работ. Устаноўлены трывалыя сувязі з Віцебскай яўрэйскай дыяспарай, Віцебскім абласным краязнаўчым і мастацкім музеямі, ВДУ імя П.М. Машэрава, Віцебскай праваслаўнай епархіяй, Віцебскім драматычным тэатрам імя Я. Коласа.

**Заключэнне.** Такім чынам, для ўстойлівага развіцця рэгіёнаў і поўнай рэалізацыі "Праграмы развіцця сяла" востра паўстала неабходнасць стварэння ў аграмястэчках культурна-краязнаўчых цэнтраў, напоўненых глыбокім, навукова абгрунтаваным краязнаўчым матэрыялам, аформленым на высокім эстэтычным узроўні, абсталяваным сучаснай мультымедыйнай тэхнікай.

Аб выніковасці работы па фарміраванні патрыятызму сведчыць паспяховая рэалізацыя праекта "Янавічане". У гонар 500-годдзя з дня заснавання г.п. Янавічы былі святочна адкрыты:

- навукова-даследчы і культурна-асветніцкі цэнтр "Янавічане";
- этнаграфічная зала "Землякі";
- выставачныя залы мастакоў В.П. Ціханава і С.І. Кухарава.

Гэта візітная картка Янавіцкай сярэдняй школы. На сённяшні дзень цэнтр "Янавічане" запатрабаваны як вучнямі ўстановы адукацыі, жыхарамі г.п. Янавічы, так і шматлікімі гасцямі. Сабраны ў час шматлікіх экспедыцый і апрацаваны членамі літаратурнага аб'яднання матэрыял, прадстаўлены ў экспазіцыях і фондах цэнтра, актыўна выкарыстоўваецца ў адукацыйным працэсе школы.

Актыўна вядзецца работа па сістэматызацыі матэрыялу па гісторыі Янавіцкай сярэдняй школы. Рыхтуецца зборнік да 150-годдзя з дня заснавання народнага вучылішча і 50-годдзя сучаснага будынка школы. Ідзе праца над праектам "Алея славы Янавіцкай зямлі".

Як кіраўнік установы адукацыі я планую ў перспектыве далейшае пашырэнне ўплыву выхаваўчага патэнцыялу цэнтра і выкарыстанне ў адукацыйным працэсе матэрыялаў фондаў і выставачных экспазіцый, каб тая тытанічная праца не засталася непатрэбнай і стала крыніцай выратавання маладога пакалення ад бяспамяцтва.

Мы не можам дапусціць, каб наша *янавіцкая* зямля бяднела на добрых працаўнікоў і гаспадароў. Сёння неабходна выхаванне чалавека, які любіў бы свой край, ганарыўся дасягненнямі землякоў, адчуваў заўсёды сябе патрэбным на сваёй зямлі.

ЛІТАРАТУРА

1. Кацэвіч, С.С. Выхаванне патрыятызму: канцэптуальны падыход / С.С. Кацэвіч // Адукацыя і выхаванне. – 1998. – № 3. – 35 с.
2. Альшэўская, Н.Н. Грамадзянская самасвядомасць: думкі і меркаванні / Н.Н. Альшэўская // Адукацыя і выхаванне. – 1998. – № 2. – 15 с.
3. Букрэеў, І.І. Краязнаўства – дзейсны сродак патрыятычнага выхавання / І.І. Букрэеў // Адукацыя і выхаванне. – 2002. – № 6. – 7 с.
4. Лугоўскі, А.І. Маральна-эстэтычнае выхаванне вучняў на ўроках беларускай літаратуры / А.І. Лугоўскі. – Мінск, 1992. – 156 с.
5. Селевко, Г.К. Современные образовательные технологии / Г.К. Селевко. – Минск, 1998. – 89 с.
6. Ксензова, В.Ю. Перспективные школьные технологии / В.Ю. Ксензова. – Минск, 2000. – 117 с.
7. Запрудскі, М.І. Мадэліраванне і праектаванне аўтарскіх дыдактычных сістэм: дапаможнік для настаўніка / М.І. Запрудскі. – Мінск: Сэр-Віт, 2008. – 334 с.

Репозиторий ВГУ

Дадатак 1

**Спіс зборнікаў,**
**выдадзеных літаратурным аб’яднаннем цэнтра “Янавічане”**

1. Знакамітыя людзі Янавіцкай зямлі:
   “М.М. Барадзін – вядомы палітычны дзеяч”, 2010 г.;
   “Я.Р. Каваленка – вучоны з сусветным імем”, 2009 г.;
   “Р.С. Гарфункін – Герой Савецкага Саюза”, 2010 г.
2. Янавічы. Вялікая Айчынная вайна:
   Зборнік успамінаў малалетніх вязняў “І ўспомніць страшна. І забыць нельга”, 2009 г.;
   Зборнік “Настаўнікі – ветэраны Вялікай Айчыннай вайны”, 2012 г.
3. Янавічы. Напярэдадні 500-годдзя.
   “Янавічам – 500 год”, 2011 г.
4. Мультымедыйныя прэзентацыі:
   “Гісторыя Янавіцкай сярэдняй школы”;
   “Янавічы. Гісторыя. Сучаснасць”.

Дадатак 2

**Мадэль выкарыстання краязнаўчых матэрыялаў**
**пры вывучэнні праграмных твораў на вучэбных занятках**
**па беларускай літаратуры [7]**

| № п/п | Праграмны твор | Матэрыял цэнтра “Янавічане” |
|---|---|---|
| 1 | Творчасць Васіля Быкава (пазакласнае чытанне)<br>Аповесць “Абеліск”. Аналітычная дыскусія “Жывыя – памяці мёртвых” 11 клас | Зборнік “Настаўнікі – ветэраны Вялікай Айчыннай вайны”, выпуск № 2, 2012 г. |
| 2 | Аповесць “Альпійская балада” | Зборнік успамінаў малалетніх вязняў “І ўспомніць страшна. І забыць нельга”<br>Відэасюжэты ўспамінаў ветэранаў “Мая непаўторная вясна” |
| 3 | І. Шамякін “Непаўторная вясна” 11 клас<br>Я. Брыль “Memento mori” 11 клас | А. Шульман “Дзясяты круг пекла” |
| 4 | З. Бядуля “Бондар” (тэма мастака і мастацтва) 10 клас<br>М. Танк “Люцыян Таполя” 10 клас | Выставачная зала мастакоў В.П. Ціханава і У.І. Кухарава<br>Відэасюжэты “Ноч музеяў з мастаком В.П. Ціханавым” |
| 5 | Урок пазакласнага чытання.<br>У. Калеснік, Я. Брыль А. Адамовіч “Я з вогненнай вёскі” | А. Шульман “Дзясяты круг пекла” |
| 6 | Беларуская сучасная паэзія.<br>П. Панчанка, В. Зуёнак, Р. Барадулін | У. Кухараў. Зборнік вершаў “Калыханка” |
| 7 | Сучасная беларуская проза.<br>В. Казько “Суд у Слабадзе”<br>І. Пташнікаў “Тартак”<br>В. Карамазаў “Пушча” | А. Шульман “Дзясяты круг пекла”<br>А. Шульман “Место его уже не узнает его”<br>А. Шульман “Осталась только память”<br>Экспазіцыя У. Іваноўскага “Мая крылатая Белая Русь” |
| 8 | Факультатыў “Мой родны кут” | Матэрыялы этнаграфічнай залы |

Репозиторий ВГУ

Дадатак 3

**Кароткі гістарычны веснік да ўрокаў беларускай літаратуры**

Гісторыя рэгіёна напоўнена цікавымі падзеямі. Напачатку XX ст. г.п. Янавічы ўяўляў сабой эканамічна-развіты цэнтр рэгіёна: працаваў жалезны, два *вінзаводы*, ільнозавод, функцыянавала кардонная, мукамольная і піваварная вытворчасць, былі два вадзяныя млыны.

У савецкія часы калгас імя *Дзімітрава* быў адным з лепшых у Віцебскай вобласці. *У.І. Сонаў* – старшыня, які ўзначальваў калгас 19 гадоў, быў адзначаны самымі высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. *Янавіцкі масласырзавод* на працягу 60 гадоў заўсёды быў у ліку перадавых сярод вытворчасці ў перапрацоўчай прамысловасці. Прадукцыя завода высока ацэнена на розных экспертных узроўнях і заўсёды запатрабавана спажыўцамі. Дырэктар Янавіцкага філіяла ААТ “Малако” *В.І. Плотнікава* ўдастоена ганаровага звання “Чалавек года Віцебшчыны” (2008).

Янавічы – гэта і культурна-адукацыйны цэнтр Віцебскага павета. Тут функцыянавалі: народнае вучылішча (1864 г.), царкоўнапрыходская школа (1880 г.), мужчынская і жаночая *двухкласная* настаўніцкія школы (1897–1918 гг.), яўрэйская, руская і беларуская школы. Напачатку стагоддзя жыццё рэгіёна было насычана культурна-асветніцкімі падзеямі. Існаваў драматычны тэатр, у рэпертуары якога былі пастаноўкі вялікіх рускіх драматургаў.

На сённяшні дзень *Янавіцкая школа* – культурна-адукацыйны і спартыўна-фізкультурны цэнтр рэгіёна. Педагагічны калектыў і навучэнцы актыўна ўдзельнічаюць у жыцці раёна. Многія настаўнікі маюць высокія ўзнагароды.

*Янавіцкая зямля* – радзіма *М.М. Барадзіна* (вядомы палітычны дзеяч), *В.І. Кухарава*, *В.П. Ціханава* (знакамітыя мастакі), *Г.С. Гарфункіна* (Герой Савецкага Саюза). Нашы землякі на сённяшні дзень паспяхова працуюць у самых розных прафесійных сферах дзейнасці.

Репозиторий ВГУ